# Маляўнічы куточак зямлі

Гурская Эмілія
дзяржаўная ўстанова адукацыі “Сярэдняя школа № 7 г. Смаргоні”
VI “Г” клас

Апошнім часам, калі на горад толькі пачынае апускацца ноч, да мяне ў акно прыветна заглядае маленькая Зорачка. Яна нядаўна нарадзілася ў бязмежных прасторах Сусвету і цяпер спяшаецца пазнаць жыццё.

Зорачцы вельмі падабаецца мой начны горад. Яна зацікаўлена пытаецца:

– Ой, Эма! А чаму ў вас такія дзіўныя зоркі вакол?

– Гэта вулічныя ліхтары. Яны асвятляюць горад. Ведаеш, Зорачка, у гэтым горадзе нарадзілася я, мой брат, мой тата, мая мама. Гэта наш родны куток. Тут жывуць добрыя, працавітыя людзі. Іх рукі будуюць дамы, упрыгожваюць вуліцы. Кожны заняты сваёй справай.

– Цікава! Толькі штосьці я нікога не бачу?

– Дзіўная ты, Зорачка! Ты прылятаеш да нас ноччу, а ноччу большасць жыхароў спіць, адпачывае пасля працоўнага дня.

– Эмілія, ты сказала “дзень”. А які твой горад днём?

– Мне здаецца, мілая Зорачка, што мой горад – самы маляўнічы куточак Зямлі. Ён хоць і мае больш за пяць соцень гадоў, але па мерках твайго Сусвету зусім яшчэ малады. Як і кожная маладая дзяўчына, Смаргонь любіць прыбірацца ў розныя строі.

Зімой яна апранае цудоўнае футра белага колеру і адразу становіцца ўрачыстай, задуменнай, таямнічай. Такой парой я люблю глядзець на свой горад у промнях ранішняга сонца. Усё вакол зіхаціць дыяментамі. Ад гэтага бляску слепнуць вочы, а на тварах людзей з’яўляюцца ўсмешкі.

Прыгожая мая Смаргонь-модніца і вясной. Белае футра яна мяняе на лёгкае, празрыстае адзенне колеру талай вады, упрыгожанае кволымі зялёнымі лісточкамі. На вуліцах і плошчах мноства першацветаў жоўтага, блакітнага, чырвонага колеру. У спевах птушак адразу пазнаеш гімн гораду, яго жыхарам і вясне.

Але мне найбольш падабаецца малахітавая сукенка маёй Смаргоні. Цёмна-зялёныя шаты дрэў у парку, люстраная гладзь вады, сіняе неба над галавой і канікулы. Што можа быць лепш?! Увесь горад становіцца маляўнічым куточкам, такім блізкім, родным, дарагім майму сэрцу.

Будзе няпоўным тваё, Зорачка, уяўленне аб маёй радзіме, калі я не раскажу табе пра восеньскія строі Смаргоні.

У гэты час яна апранаецца ў чырвоныя, жоўтыя, аранжавыя колеры. Стракаты дыван з апалага лісця шапаціць пад нагамі, у паветры лятае срэбранае павуцінне, а на галінцы пачынае сваю развітальную песню мясцовы шпачок.

Сумна, што прайшло лета. Але ў сэрцы жыве надзея і ўпэўненасць у шчаслівай будучыні майго маляўнічага куточка зямлі.

– І мне сумна, Эма. Не хочацца развітвацца. Пасля гутаркі з табой я таксама палюбіла твае мясціны.

– Мілая Зорачка! Не толькі цябе чаруе мой горад. Мастакі пішуць пейзажы Смаргоні, кампазітары складаюць песні, паэты прысвячаюць ёй вершы. Ганаровы грамадзянін Смаргоні паэт Мар’ян Дукса ў адным са сваіх вершаў выказаў такое пажаданне:

Плыві, квітней і велічна свяціся
На хвалях часу, родная Смаргонь!

Так, як наш знакаміты зямляк, думаю і я.

– Дзякую табе, Эма, за цікавы аповед. Я раскажу пра гэты маляўнічы куточак сваім сястрычкам. Бывай! Да новых сустрэч!

Зорачка гарэзліва бліснула і знікла ў сваім таямнічым халодным Космасе.

Неба паступова святлела. Пачынаўся новы дзень.